Следства вядуць дэпутаты (стар. 2)

Белорусские власти в зеркале общественного мнения (стар. 3)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец "Газэта СВАБОДА, Ltd."
Наклад 39.500
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2362441

2 ліпеня 1996 г. | № 48 | Кошт свабодны

Услед за Хадыкам і Сіўчыкам – Вячорка

Мінская гарадская пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу супраць яшчэ аднаго кіраўніка БНФ — намесніка старшыні Народнага фронта 33-гадовага Вінцука Вячоркі.

На мінулым тыдні В.Вячорка быў выкліканы ў пракуратуру, дзе яму было прад'яўленае абвінавачанне па артыкуле 188 Крымінальнага Кодэксу (*«пагроза работнікам праваахоўных органаў з мэтай перашкодзіць выкананню імі сваіх абавязкаў»*), які прадугледжвае пакаранне ад штрафа да аднаго года папраўчых работ. Справу вядзе ўсё той жа сумнавядомы следчы Сяргей Новікаў, які трымаў за кратамі Ю.Хадыку і В.Сіўчыка.

Што ж інкрымінуюць Вячорку? Цытуем абвінавачанне: *«24 марта 1996 г., во время проведения митинга по случаю празднования 78-й годовщины Белорусской Народной Республики, проходившей в г.Минске на площади Парижской коммуны, Вечорко В.Г., зная о задержании работниками милиции Московского РОВД гражданина Рымашевского В. за совершение административного правонарушения, неоднократно выходил к микрофону и перед многотысячным митингом публично обращался к подполковнику милиции, заместителю начальника службы общественной безопасности УВД Мингорисполкома Дрозду Н.Н., который находился при исполнении своих служебных абязанностей по охране общественного порядка, с требованием в течение 10—15 минут освободить гр-на Рымашевского В. В противном случае, если это требование не будет выполнено, Вечорко высказывал намерение провести 30 тысяч митингующих по ул.Немига к зданию Московского РОВД, где находился задержанный Рымашевский В., чтобы самим разобраться с работниками милиции»*.

Так выглядае гэты эпізод у інтэрпрэтацыі пракуратуры. У сапраўднасці ж сітуацыя была наступная: В.Вячорка, які быў адным з вядучых мітынгу, зачытваў запіскі, што паступалі ад публікі. У адной з іх выказвалася абурэнне фактам затрымання студэнта В.Рымашэўскага (пазней ён быў выпушчаны судом з «устным предупреждением»). Цікава, што падпалкоўнік Дрозд, які фігуруе ў гэтай справе ў якасці пацярпелага, звярнуўся з заявай ў пракуратуру толькі праз два месяцы.

Нагадаем, што Вячорку ўжо спрабавалі «прышыць» справу за падзеі 26 красавіка. На наступны дзень пасля «Чарнобыльскага шляху» ён быў арыштаваны і больш за трое сутак утрымліваўся ў камеры, але быў адпушчаны «з-за адсутнасці ўлік».

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ

Грамада і ПНЗ аб'ядналіся ў адну партыю

У мінулую суботу ў Мінску адбыўся з'езд, які аб'яднаў Беларускую сацыял-дэмакратычную Грамаду і Партыю народнай згоды ў адзіную арганізацыю. Яна атрымала назву Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя «Народная Грамада».

Статут новай партыі па сутнасці дубліруе арганізацыйныя прынцыпы Грамады: прыём па рэкамендацыі, абавязковыя складкі (ад 0,5% да 1% заробку), магчымасць выключэння члена партыі. З'езд зацвердзіў сустаршынямі ЦК БСДП лідэраў абедзюх партый-стваральніц — Міколу Статкевіча ад Грамады і Леаніда Сечку ад ПНЗ. Акрамя сустаршынства, кожны з іх будзе выконваць спецыяльныя функцыі: Статкевіч узначаліць выканаўчае бюро, якое зоймецца ў асноўным арганізацыйным будаўніцтвам, а Леанід Сечка будзе кіраваць дэпутацкай групай. Яна, дарэчы, павялічылася — на з'ездзе заяву аб уступленні ў новую партыю падаў былы спікер парламента Мечыслаў Грыб. Рэвізійную камісію аб'яднанай партыі ўзначаліў Георгій Таразевіч.

Як і мае быць, з'езд зацвердзіў праграму партыі. Яе галоўныя прынцыпы наступныя: сацыяльная дэмакратыя, дзяржаўны суверэнітэт Беларусі і безумоўнае выкананне Канстытуцыі РБ. У заяве, прынятай ад імя новай партыі, звяртаецца ўвага на хуткае набліжэнне эканамічнай катастрофы, да якой вядзе палітыка сённяшняга ўраду. Аб'яднаныя сацыял-дэмакраты заклікаюць кіраўніцтва краіны правесці шырокія кансультацыі з палітычнымі арганізацыямі і прызначыць новы ўрад народнага даверу, якому з мэтай выратавання эканомікі надаць большыя паўнамоцтвы.

Хоць аб'яднанне і адбылося, ставіць крыж на самастойным лёсе ПНЗ і Грамады пакуль зарана. Ускоснае пацвярджэнне таго, што пэўны час яны яшчэ будуць працягваць аўтаномнае плаванне, можна знайсці нават у тым, як па-рознаму праходзілі з'езды абедзюх арганізацый перад аб'яднаўчым форумам. «Згоднікам» удалося амаль без дыскусій прыняць усе прадугледжаныя раней рашэнні, а Леанід Сечка быў вылучаны і абраны на пасаду сустаршыні новай партыі нават без альтэрнатывы і аднадушна. Падобнага паразумення паміж грамадоўцамі на іх з'ездзе не назіралася, аднак апазіцыя да сённяшняга лідэра Грамады Міколы Статкевіча таксама раздваілася. Адны пайшлі за Алегам Трусавым, які хутчэй за ўсё будзе ствараць іншую арганізацыю, другія прапанавалі ў якасці альтэрнатывы Статкевічу кандыдатуру былога старшыні КДБ, а сёння дэпутата ВС Уладзіміра Ягорава. Абедзве гэтыя спробы, аднак, не здолелі перашкодзіць Грамадзе злучыцца з ПНЗ. За аб'яднанне прагаласавалі 92 дэлегаты, супраць — 4, устрымаліся — 2. Пацвердзіў сваё лідэрства сярод грамадоўцаў і Мікола Статкевіч, які на выбарах старшыні атрымаў 82 галасы «за» пры 22 «супраць».

Як Леанід Сечка, так і Мікола Статкевіч у сваіх каментарах для СВАБОДЫ вызначаюць аб'яднанне партый як значную з'яву ў палітычным жыцці краіны. На іх думку, ужо можна казаць, што нарэшце аформілася трэцяя палітычная сіла (паміж ПКБ і БНФ). Абодва сустаршыні БСДП не дэманструюць прэтэнзіі стаць адзінаасобным правадыром партыі, але падкрэсліваюць, што калі з'явіцца неабходнасць вызначыць аднаго кіраўніка, гэта можна будзе зрабіць дэмакратычна, не парушаючы сённяшняга статута, у якім прадбачліва пакінутая магчымасць і адзіночнага лідэрства.

Незалежныя назіральнікі, між тым, ужо цяпер прадказваюць непазбежнае абвастрэнне барацьбы ў кіраўніцтве БСДП. І рэч не толькі ў здаровых амбіцыях двух вядомых палітыкаў, якія яны пакуль удала хаваюць. У першую чаргу, нягледзячы на дэклараваную аднолькавасць палітычных пазіцый, рознымі будуць заставацца тыя групоўкі партыйных функцыянераў, якія застануцца апорай Сечку і Статкевічу. У ПНЗ апошнім часам павялічыўся ўплыў сярэдняга чынавенства, адцясніць якое Статкевічу і яго сябрам-«тэарэтыкам» наўрад ці ўдасца. З іншага боку, і згодаўцам у бліжэйшы час будзе цяжка змагацца з грамадоўцамі, якія набілі руку на ўдзеле ў масавых акцыях, а гэты вопыт яшчэ не раз спатрэбіцца партыі. Гэтыя меркаванні прыводзяць аглядальнікаў да высновы, што адносная раўнавага ўнутрыпартыйнага рэйтынгу Леаніда Сечкі і Міколы Статкевіча захаваецца як мінімум да восеньскіх парламенцкіх выбараў. Хутчэй за ўсё, праблему лідэрства паміж імі вырашыць пытанне, ці здолее Мікола Статкевіч стаць дэпутатам ВС.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Народу прапануюць павесяліцца

6 ліпеня ў Мінску адбудзецца свята горада, якое плаўна пяройдзе ў свята Купалля і завершыцца ў нядзелю ў 5 гадзін раніцы.

Як паведамілі ў Мінгарвыканкаме, сцэнарый купальскай ночы пакуль не зацверджаны. А вось на свята горада запланаваная опера «Дзікае паляванне караля Стаха», якую праспяваюць на двары ў Траецкім прадмесці, а ў раёне лодачнай станцыі станцуюць «балет на вадзе», які скончыцца феерверкам. У скверы Янкі Купалы адбудуцца канцэрты класічнай музыкі.

Каля кінатэатра «Масква» ладзіцца фестываль моды і прычосак, на вуліцы Камсамольскай — спаборніцтвы па шахматах.

Пляцоўку каля Палаца спорту з 19 да 22 гадзін зоймуць піўзаводы. У праграме «свята піва» — спецыяльныя спаборніцтвы, пераможцы якіх атрымаюць у якасці прыза адмысловыя літровыя бутэлькі пеністага напою.

Мікола ВАЙТОВІЧ

КАНФЛІКТ

Прэзідэнт «канфіскаваў» парламенцкую газету

А папярэднічалі гэтаму спробы Вярхоўнага Савета замацавацца на «інфармацыйным полі»

Надзеі парламента на змены ў асвятленні яго дзейнасці дзяржаўнымі СМІ варта звязаць з наступнымі Законамі: «Аб унясенні дапаўненняў і змен у Кодэкс РБ аб адміністратыўных парушэннях» і «Аб унясенні дапаўненняў у Закон РБ «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». Першы з іх быў прыняты парламентам і, не атрымаўшы вета прэзідэнта, хутка ўступае ў дзеянне. Развіццю і ўмацаванню галоснасці ён спрыяе тым, што ўводзіць меры адказнасці службовых асоб, якія парушаюць парадак асвятлення ў СМІ дзейнасці вышэйшых органу ўлады. Напрыклад, калі цяпер кіраўнік БТ дапусціць адпаведнае парушэнне, на яго можна будзе накласці штраф у памеры ад 20 да 50 мінімальных зарплат. Таксама гэтым законам прадугледжана адказнасць чыноўнікаў за адмову прадаставіць у СМІ неабходную журналістам, а галоўнае даставерную інфармацыю.

Не менш істотнымі можна назваць змены, прынятыя ў закон аб друку. Прадугледжана, напрыклад, што дзяржаўнае тэлебачанне будзе абавязана не пазней чым праз 24 гадзіны распаўсюджваць звароты і заявы не толькі прэзідэнта, але і старшыні Вярхоўнага Савета, Канстытуцыйнага суда, Кабінета міністраў. У інфармацыйныя праграмы неабходна будзе даваць навіны аб выступленнях гэтых вышэйшых асобаў, рэпартажы з іх прэс-канферэнцыяй, справаздачы аб падзеях, звязаных не толькі з дзейнасцю прэзідэнта, але і парламента. Дэпутаты таксама праявілі заклапочанасць іміджам парламенцкіх фракцый. Згодна з папраўкамі, кожная з дэпутацкіх фракцый зможа разлічваць не менш як на 30 хвілін тэлеэфіру ў месяц. А самі дэпутаты змогуць выступаць раз у тры месяцы па мясцовым тэлебачанні або раз у месяц па мясцовым радыё.

Закон гэты ўжо прыняты і адпраўлены на подпіс прэзідэнту. Але ёсць меркаванні, што той можа накласці на яго вета. Пасля гэтага, каб увесці закон у дзеянне, патрэбна будзе, каб за яго зноў прагаласавалі ўжо дзве трэці дэпутатаў. Ці магчымая такая падтрымка? Як лічыць дэпутат Іван Цярэшка, распрацоўшчык пераліченых актаў, большасць парламента ўжо зразумела, што сённяшняе замоўчванне дзейнасці ВС у дзяржаўных СМІ, асабліва электронных, непазбежна прывядзе да дыскрэдытацыі і палітычнай смерці Вярхоўнага Савета. І таму нарастае жаданне супрацьстаяць гэтай тэндэнцыі.

Між тым выканаўчая ўлада наўрад ці будзе спакойна назіраць, як замацоўвае свае пазіцыі Вярхоўны Савет — што і было прадэманстравана прэзідэнтам у гісторыі з «канфіскацыяй» «Народнай газеты». Як высветлілася, за дзень да з'яўлення прэзідэнцкага ўказу аб стварэнні закрытага акцыянернага таварыства «Народная газета» на чале з М.Шыманскім, парламенцкая камісія па СМІ выказалася за тое, каб на пасаду рэдактара быў прызначаны не М.Шыманскі, а дэпутат Л.Юнчык. На наступным тыдні сесія павінна была зацвердзіць рэдактара «НГ». Аднак прэзідэнт апярэдзіў парламент і сваім указам не толькі прызначыў М.Шыманскага рэдактарам, але і наогул змяніў статус «Народнай газеты» (з парламенцкай яна фактычна ператвораная ў прэзідэнцкую). Хутчэй за ўсё Вярхоўны Савет звернецца ў Канстытуцыйны суд.

Алесь ПАЎЛОВІЧ

ПАМЯЦЬ

Чэрвеньскія «курапаты»

У нядзелю 30 чэрвеня на ўскраіне райцэнтра Чэрвень, што ў 70-ці кіламетрах ад Мінска, адбылося ўшанаванне памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў. Разам з беларусамі тут знайшлі апошні спачын рэпрэсаваныя грамадзяне Літвы і Польшчы, яны былі расстраляныя органамі НКВД.

На здымках: на жалобны мітынг прыехалі каля 100 чалавек з Мінска, 80 чалавек з Літвы і дэлегацыя з Польшчы. Удзельнічалі таксама мясцовыя жыхары. Літоўскі хор выканаў некалькі твораў у памяць ахвяраў. З успамінамі выступілі сведкі тых трагічных падзей.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ПАРЛАМЕНТ

Следства вядуць дэпутаты

Напрыканцы мінулага тыдня Вярхоўны Савет заслухаў справаздачы дзвюх часовых камісій, створаных для расследавання веснавых падзей.

Увечары 27 чэрвеня ў Авальнай зале Мечыслаў Грыб падвёў рысу пад расследаваннем затрымання 26 красавіка праваахоўнымі органамі дэпутата Паўла Знаўца. Яго затрымалі, даставілі ў Цэнтральны РАУС і ўтрымлівалі там з вечара 26.04 да 14:30 наступнага дня незаконна — да такой высновы прыйшла камісія.

У заключэнні часовай камісіі ёсць досыць пікантныя дэталі красавіцкага надзвычайнага здарэння. Дагэтуль невядома, хто канкрэтна затрымаў народнага абранніка. Але ў камісіі ёсць падставы меркаваць, што дачыненне да гэтага мелі супрацоўнікі спецпадраздзяленняў «Альфа» і «Алмаз». Загад на затрыманне 26 красавіка ў штаб-кватэры БНФ Паўла Знаўца і яшчэ дзесяці чалавек аддавалі асабіста міністр унутраных справаў Валянцін Агалец і старшыня КДБ Уладзімір Мацкевіч — кіраўнікі створанага ў той жа дзень *«аператыўнага штаба па каардынацыі дзейнасці праваахоўных органаў у спыненні масавых беспарадкаў»*. Ні адзін, ні другі не адмаўляюць гэтага. У сілавікоў запыталіся: навошта было затрымліваць людзей пасля завяршэння «Чарнобыльскага шляху-96», у 22:30, калі ўсе «масавыя беспарадкі» ўжо даўно скончыліся? Адказу дэпутаты не дачакаліся.

Першы намеснік старшыні КДБ Леанід Ерын, барончаю гонар свайго ведамства, заявіў, што найперш парламент мусіў бы стварыць камісію па расследаванні святкавання 75-й гадавіны БНР 24 сакавіка, па падзеях 2 красавіка *(«дзякуючы дзеянням праваахоўных органаў 2 красавіка нічога не здарылася»)* і толькі потым расследаваць падзеі 26 красавіка і 30 траўня. *«Рыхтуйцеся, што будзе створаная яшчэ адна камісія,»* — папярэдзіў парламентарыяў Л.Ерын, — па расследаванні падзей у *«надуманыя святы»*: 27 ліпеня, 8 верасня, — у якія *«вядома хто»* рыхтуе правакацыі. Дзіўна, што дзяржаўны муж такога рангу называе афіцыйны Дзень незалежнасці, які краіна штогод адзначае 27 ліпеня, надуманым.

Разгляд «справы Знаўца» завяршыўся прыняццем пастановы. У ёй парламент канстатаваў парушэнне заканадаўства ў дачыненні да П.Знаўца з боку прадстаўнікоў праваахоўных органаў і невыкананне МУС і КДБ пастановы Вярхоўнага Савета (гэтыя ведамствы не прадставілі часовай камісіі матэрыялы наконт таго, хто канкрэтна і на якой падставе затрымліваў дэпутата). На восеньскай сесіі парламент заслухае В.Капітана, В.Агальца і У.Мацкевіча па выніках службовага расследавання аб парушэннях заканадаўства работнікамі ўзначальваных імі структур у дзень 26 красавіка.

Камісія па расследаванні мінскіх падзеяў 26 красавіка і 30 траўня (даклад яе старшыні Таццяны Хадневіч парламент слухаў у пятніцу) яшчэ не завяршыла работу і не прыйшла да пэўных высноў. Праўда, члены камісіі сышліся на тым, што неабходна расследаваць правамернасць прымянення праваахоўнымі органамі ў гэтыя дні спецсродкаў супраць удзельнікаў масавых акцый. Часовая камісія з мэтай вывучэння абставін плануе прааналізаваць і публікацыі ў беларускіх СМІ, якія папярэднічалі згаданым падзеям; магчыма, яна знойдзе канкрэтных аўтараў і публікацыі, якія правакавалі драматычнае развіццё падзей 26 красавіка і 30 траўня. А так, прыняўшы інфармацыю Т.Хадневіч «да ведама», Вярхоўны Савет даручыў камісіі дакласці аб выніках сваёй працы пасля заканчэння расследавання ўзбуджанай па ўказаных падзеях крымінальнай справы. А гэта адбудзецца не раней, чым у восень.

Пэўнае афармленне атрымала і «справа Ганчара», разгляд якой прайшоў за лічаныя хвіліны. Сам дэпутат даволі прахалодна ўспрыняў дапрацаваны трыма камісіямі праект пастановы па падзеях ночы 14 чэрвеня. В.Ганчар з самага пачатку дамагаўся рэакцыі Вярхоўнага Савета на «вакханалію ў СМІ і незаконнае затрыманне шафёра», але паколькі гэтыя дзве акалічнасці не знайшлі адлюстравання ў праекце, дэпутат запатрабаваў выкасаваць з пастановы прозвішча паранепай сакраткі і зрабіць яшчэ адну праўку. На тым і пагадзіліся. Парламент даручыў генпракурору В.Капітану дакласці аб выніках расследавання ўзбуджанай крымінальнай справы, а міністр унутраных справаў В.Агалец і старшыня Вярхоўнага суда павінны вызначыць правамернасць дзеянняў сваіх падначаленых, якія мелі дачыненне да інцыдэнту з В.Ганчаром, і інфармаваць пра гэта дэпутатаў.

Карысці ад таго, што замест сваёй асноўнай функцыі (заканатворчай працы) парламент мусіць займацца іншымі праблемамі — расследаваннем падзеяў 26 красавіка, 30 траўня, «справы Ганчара», галоўнымі героямі якіх выступаюць «сілавікі», — няма ніякай. Толькі ж вінаваціць за іхнюю «папулярнасць» каго б там ні было Вярхоўнаму Савету не выпадае; ва ўсіх на памяці, як некалькі месяцаў таму ў Авальнай зале дэпутаты давалі згоду на прызначэнне і В.Агальца, і У.Мацкевіча. І за гэтыя лічаныя месяцы яны сталі галаўным болем парламента. Але ці тое яшчэ будзе?.. Чаго вартая выказаная на сесіі першым намеснікам міністра ўнутраных справаў Фарыдам Канцэравым рэпліка: *«Затрымліваць Знаўца было менш за ўсё падставаў у параўнанні з таварышамі з гэтай залы, якія ўдзельнічалі ў гэтых мерапрыемствах»*. І гэта сказана пра людзей, надзеленых дэпутацкім імунітэтам...

Раман ЮРЭВІЧ

Самообман валютного регулирования

Президент дал добро на рост доллара до отметки 15.500 BRB/USD до конца 1996 года

Инфляционные ожидания уже давно захлестнули всех участников финансового рынка и в последний месяц достигли своего апогея. Усиление ажиотажа — следствие, прежде всего, окончания срока действия валютного коридора (в рамках 11.300 — 13.100 BRB/USD) 1 июля. Естественно, что все ждут либо новых рамок, либо объявления конкретных темпов девальвации белорусского рубля на второе полугодие 1996 года.

25 июня А.Лукашенко вместе с представителями Кабинета министров и банковских структур рассматривал концепцию экономического развития Беларуси на второе полугодие 1996 и 1997 год. Президент объявил, что он не допустит роста курса до 15.000 — 17.000 рублей за доллар в ближайшем будущем.

Однако уже 28 июня Лукашенко передумал. В своем интервью белорусскому телевидению он изложил основные моменты программы финансовой стабилизации на второе полугодие. Президентом подписан указ «О дополнительных мерах по упорядочению валютного регулирования на территории РБ», который несколько противоречит сказанному ранее.

Как заявил Лукашенко, начиная с 1 июля Национальный банк будет определять обменный курс на основе учета трех важнейших факторов: соотношения спроса и предложения на внутреннем валютном рынке, состояния торгового баланса республики и темпов инфляции.

Если не считать первые два фактора определяющими (вероятнее всего, это лишь формальная формулировка с претензией на рыночность), то курс национальной валюты во втором полугодии привязывается к темпам инфляции. В связи с этим перед Национальным банком, правительством и государственными структурами, имеющими отношение к финансовым проблемам, «ставится задача обеспечить мерами экономического характера обменный курс белорусского рубля в период до 31 декабря текущего года не выше 15.500 рублей за доллар США».

Фактически установлен новый валютный коридор до конца года, верхняя граница которого находится на отметке 15.500 BRB/USD. Остается лишь пара несущественных вопросов. Что делать с тем фактом, что уже до 1 июля курс «черного рынка» (а это и есть тот рынок, где котировки устанавливаются с учетом спроса и предложения) перешел 15-тысячный рубеж? И непонятно, какими же экономическими мерами будет обеспечиваться показатель 15.500, например, в декабре 1996 года. Интересно было бы также узнать, на сколько порядков реальный темп роста инфляции отличается от официального, к которому идет привязка.

Ответы на эти вопросы мы получим уже очень скоро, причем делать какие-то прогнозы в этом направлении совершенно бессмысленно (слишком уж непредсказуемы возможные действия нашего руководства, не исключена также вероятность «передумывания»).

Помимо верхней границы коридора указом предусмотрен ряд «послаблений» участникам валютного рынка. С 1 июля этого года обязательная продажа валютной выручки будет осуществляться в 50-процентном размере (вместо 100 % ранее). Кроме того, покупатели валюты на бирже с 1 июля освобождаются от 10-процентного сбора при ее приобретении (что прежде заметно увеличивало для них официальный курс торгов).

Что выигрывает экономика от принятия вышеперечисленных мер?

Ровным счетом ничего. Новая величина курса остается далекой от реальности. Купить СКВ на бирже по-прежнему будет крайне сложно, и неясно, как таким образом будет «поправляться» торговый баланс. Снижение размера обязательной продажи до 50 % уменьшит соответственно и предложение валюты на бирже, что потребует ужесточения отбора заявок на покупку и заставит Нацбанк хорошо потратиться на поддержание курса на уровне «реального» соотношения спроса и предложения. Экспортерам же такая поблажка вряд ли поможет. Для них это слишком мизерная уступка.

Наталья УЛЕВСКАЯ

Беларусь засталася без сімволікі

Дзень 28 чэрвеня 1996 г. увойдзе ў аналы беларускай гісторыі дзякуючы прынятаму Вярхоўным Саветам дзіўнаму закону, паводле якога страцілі сілу 20 заканадаўчых актаў, што апісвалі дзяржаўную сімволіку — бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня».

Нагадаем, што з ініцыятывай прыняцця падобнага законапраекта выступіў прэзідэнт Лукашэнка, а ўзначаленая камуністам У.Плецюховым парламенцкая камісія па адукацыі і культуры яшчэ 14 сакавіка падтрымала прапанову кіраўніка дзяржавы.

Пытанне аб разглядзе згаданага закона ўзнікла на пустым месцы — яго нават не было ў парадку дня сесіі. Але нечаканую прапанову У.Плецюхова старшынствуючы Васіль Новікаў паставіў на галасаванне — і законапраект быў уключаны ў парадак дня. Падчас яго абмеркавання стала ясна, што падзеі разгортваюцца па загадзя распрацаваным камуністамі сцэнары. Нягледзячы на прапанову Паўла Данэйкі адкласці разгляд закона на восень і на тое, што Павел Знавец паказаў неадпаведнасць паміж вынесеным на рэферэндум варыянтам сімволікі і цяперашнім (у прыватнасці, нагадаў дэпутат, на гербе з'явілася *«зорка Ціцянкова»*), законапраект быў пастаўлены на паіменнае галасаванне. 120 дэпутатаў выказаліся за адмену законаў, якія апісвалі бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня». Тым самым яшчэ раз паказала сваю моц і арганізаванасць камуна-прапрэзідэнцкая большасць Вярхоўнага Савета, а дэмакратычная меншасць аказалася бяссільнай нешта супрацьпаставіць ёй.

Прынцыце гэтага закона каментуюць дэпутаты В.Ганчар і М.Грыб.

Віктар Ганчар: *«Сімволіка, уведзеная ўказам прэзідэнта, адрозніваецца ад той, якая была вынесеная на рэферэндум... Цяпер сітуацыя даведзеная да поўнага абсурду і з палітычнага, і з прававога пункту гледжання: дзяржава фактычна засталася без легалізаванай сімволікі»*.

Адзін з асноўных распрацоўшчыкаў новай беларускай Канстытуцыі **Мечыслаў Грыб** нагадаў, што, паводле Асноўнага Закону, дзяржаўная сімволіка павінна апісвацца заканадаўча. Хоць дэпутат лічыць, што *«па выніках рэферэндуму яна можа быць зацверджаная і ўказам прэзідэнта»*. Так што з гэтага пункту погляду ўсё законна. Але М.Грыб падкрэсліў некалькі нюансаў. Па-першае, большасць тых, хто прыйшоў летась 14 траўня на рэферэндум, выказвалася за змену сімволікі, але на якую — прапанаваную А.Лукашэнкам ці іншую — народнае галасаванне адказу не дало. Апрача таго, *«ёсць цэлы шэраг разыходжанняў праектаў, якія былі на рэферэндуме, з той сімволікай, якую мы маем цяпер»*, — адзначыў М.Грыб.

Бяздумна прагаласаваўшы за прапанаваны прэзідэнтам закон, беларускі парламент пакінуў суверэнную краіну без асноўных сімвалаў дзяржаўнасці.

Раман ЮРЭВІЧ

Тэрмін выдачы чэкаў «Маёмасць» працягнуты да 1 ліпеня 1997 года

Паводле дзеючага да нядаўняга часу заканадаўства, сёлета 30 чэрвеня заканчваўся тэрмін прыняцця дакументаў на атрыманне іменных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць», а 31 снежня мусіў закончыцца і працэс выдачы чэкаў. Зыходзячы з рэаліяў сённяшняга дня (больш за 1,5 мільёнаў грамадзян яшчэ не рэалізавалі свае законныя правы) беларускі парламент 27 чэрвеня працягнуў тэрміны афармлення дакументаў да 31 снежня 1996 года, а выдачы чэкаў — да 1 ліпеня 1997 года.

Раман ЮРЭВІЧ

Калгасы зноў просяць грошай

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання запрасіла ад урада Беларусі субсідыю ў 1,7 трыльёна рублёў на ўборачную кампанію гэтага года.

Пра гэта паведаміў першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка рэспублікі Мікалай Корбут. Па ягоных словах, Нацбанк разам з Асацыяцыяй камерцыйных банкаў і Кабінетам міністраў разглядае магчымасць выдзялення такой субсідыі.

БелаПАН

Рабочыя – гарой за дырэктара

2 тысячы работнікаў Магілёўскага жэлацінавага завода выступілі супраць звальнення дырэктара прадпрыемства Вікенція Ермаленкі.

Яго хацелі зняць за тое, што заробкі на заводзе перавышалі прадугледжаны тарыфнай сеткай. Другая прычына — завод не падпарадкоўваўся патрабаванням фармальнага ўласніка — аблсельгасгандлю, — які прымушаў безагаворачна браць на перапрацоўку сыравіну ад мясцовых пастаўшчыкоў, нават калі гэта было зусім нявыгадна.

Тымчасам пры Ермаленку завод працаваў стабільна, з рэнтабельнасцю 20 %. Рабочыя атрымлівалі тут у сярэднім 600—700 тыс. рублёў, прычым заўсёды ў тэрмін. Працаўнікі завода гатовыя распачаць страйк у абарону дырэктара, а адна эмацыянальная работніца нават заявіла, што са зменай дырэктара на прадпрыемстве можа пачацца «другая Чачня».

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Не будзе грошай – не пойдзем у адпачынак

Настаўнікі Кастрычніцкага раёна Магілёва адмовіліся ісці ў адпачынак, пакуль ім не выплацяць «адпускныя».

Педагогі даслалі на адрас мясцовых уладаў ультыматыўны ліст.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

КАДРЫ

Рускі транзіт

Былы першы сакратар ЦК КПБ, а цяпер дэпутат Вярхоўнага Савета Анатоль Малафееў у вагоне цягніка Мінск—Масква.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Белорусские власти в зеркале общественного мнения

В рамках нового проекта «Формирование общественных лидеров в посткоммунистической Беларуси», осуществляемого при поддержке Центра международного частного предпринимательства, Независимый институт социально-экономических и политических исследований (НИСЭПИ) в мае-июне 1996 года провел общенациональный опрос взрослого населения Беларуси по репрезентативной выборке (1.535 человек, ошибка выборки ≈ 3%). Поскольку одним из важнейших элементов системы лидерства являются структуры власти, первая публикация итогов этого опроса посвящается отношению населения к властным структурам Беларуси.

Как показали результаты опроса, *ни одна из основных структур власти Беларуси не пользуется безусловным доверием и поддержкой большинства населения.* Менее половины опрошенных связывают свои надежды на выход страны из экономического кризиса с президентом, немногим более 15% — с правительством, менее 7% — с парламентом, чуть более 5% — с местными властями.

Одним из факторов низкого доверия к власти является снижение жизненного уровня людей. *Почти три четверти населения Беларуси сегодня едва сводят концы с концами.* Приобретение же предметов длительного пользования для большинства становится неосуществимой мечтой.

Материальное положение населения (здесь и далее в %)

Нынешние доходы	Не позволяют	Едва позволяют	Вполне позволяют
Нормально питаться	26,0	48,5	25,5
Приобретать одежду	47,3	42,0	10,7
Делать более крупные приобретения (мебель, машину, квартиру) и т. п.	89,2	9,9	0,9

Отсутствие реальных экономических реформ и эксперименты в области строительства «рыночного социализма» привели к тому, что Беларусь прочно заняла место одного из аутсайдеров среди стран с переходной экономикой. По мнению подавляющего числа респондентов, *уровень жизни в Беларуси ниже, чем у наших ближайших соседей* (имевших, кстати говоря, примерно одинаковые стартовые условия с нашей страной). Исключением является лишь Украина.

Сравнительная оценка уровня жизни в соседних странах

По сравнению с указанными странами уровень жизни в Беларуси	Ниже	Такой же	Выше
Польша	89,1	9,0	1,9
Латвия	88,0	10,3	1,7
Литва	84,1	13,0	2,9
Россия	69,8	27,4	2,8
Украина	15,2	35,1	49,7

Почему же Беларусь никак не может выйти из экономического кризиса? Главная причина, по мнению опрошенных, состоит *в неспособности нынешней власти найти верное решение.* Традиционные ссылки властей на «определенные силы», препятствующие выходу из кризиса, а также на «местную специфику», готово принять значительно меньшее число респондентов.

Распределение ответов на вопрос: **«Почему Беларусь так долго не может выйти из кризиса, в то время как другие страны уже преодолели его?»**

В стране нет людей у власти, способных найти верное решение	49,9
В Беларуси есть люди, препятствующие выходу страны из кризиса	40,5
Наши проблемы так сложны, что быстро их не разрешишь	22,9

Ответственность за ухудшение экономической ситуации население возлагает главным образом на различные структуры власти: более 50% опрошенных — на Кабинет министров, более 42% — на президента, около 33% — на Верховный Совет, более 16% — на местные власти. Подавляющее большинство не считает ни Запад, ни демократов, ни масс-медиа виновными в экономическом кризисе, и даже мафия уступила в этом «рейтинге» структурам исполнительной власти.

Распределение ответов на вопрос: **«Кто несет ответственность за ухудшение экономического положения в Беларуси?»**

Кабинет министров	50,8
Президент	42,4
Мафия	33,4
Верховный Совет	32,6
Местные власти	16,3
Руководители государственных предприятий, колхозов и пр.	13,6
Демократы	9,5
Белорусские предприниматели	8,3
Коммунисты	8,2
Запад	6,8
Конституционный суд	5,3
Иностранный капитал	5,2
Средства массовой информации	5,1
Международный валютный фонд	4,0
Россия	1,3

Однако низкий уровень доверия народа к власти нельзя объяснять только снижением его жизненного уровня. Важнейшим фактором такого отношения является также сам образ представителей власти в общественном сознании. Как видно из следующей таблицы, *наиболее характерными чертами белорусских политиков и государственных деятелей,* по мнению людей, являются *жажда наживы, нечестность, авантюризм, использование любых средств для достижения личных целей.* Характерно также, что почти половина респондентов вообще затруднилась ответить на этот вопрос, вероятно, из-за отсутствия достаточной информации о деятельности конкретных представителей властных структур (что само по себе является признаком недемократичности управления).

Качества белорусских политиков и государственных деятелей

Свойственны ли белорусским политикам и государственным деятелям следующие качества	Да	Нет	Затрудняюсь ответить
Жажда наживы	45,3	11,6	43,1
Склонность к жульничеству	42,7	15,4	41,9
Неразборчивость в средствах достижения своей цели	35,6	17,6	46,8
Низкий уровень общей культуры	34,2	19,2	46,6
Авантюризм	32,4	17,5	50,1
Нежелание честно трудиться	31,5	18,1	50,4
Инициативность, настойчивость	30,9	24,1	45,0
Непрофессионализм, некомпетентность	29,8	18,0	52,2
Трудолюбие	24,1	29,6	46,3
Рационализм	20,3	25,9	53,8
Способность отстаивать интересы народа, своих избирателей	15,8	40,6	43,6
Честность, порядочность	13,5	37,1	49,4
Высокий уровень общей культуры	13,3	42,2	44,5
Высокий профессионализм	12,6	41,2	46,2

Одной из причин подобного образа представителя власти является мнение народа о том, как эта власть формируется. Только 17,4% респондентов считают, что руководящие должности распределяются исключительно по *профессиональным качествам.* Значительно большая часть населения убеждена в том, что главную роль здесь играют *деньги и личные связи* — соответственно 43% и 68,9% опрошенных. Личные связи как механизм вхождения во власть известен в нашем обществе давно, со времен застоя, а вот коррупция в таком масштабе — явление новое.

Вероятно, поэтому большая часть населения отдает предпочтение более демократическим методам формирования руководящих кадров. Например, три четверти опрошенных считают, что глава местной исполнительной власти должен избираться населением, тогда как за действующий механизм формирования исполнительной вертикали высказалось лишь около 16% респондентов.

Распределение ответов на вопрос: **«Какое устройство местной власти является более предпочтительным?»**

Глава местной исполнительной власти избирается всем населением соответствующей территории	74,1
Глава местной исполнительной власти назначается президентом	15,9
Глава местной исполнительной власти избирается местным советом	10,0

Важным элементом образа власти являются также представления о *материальном положении* власть предержащих и его соответствии *реальным заслугам.* Так, большинство респондентов оценивают материальное положение представителей исполнительной и законодательной власти как хорошее. В то же время совершенно по-иному оценивается материальное положение представителей так называемой «четвертой власти» — журналистов.

Распределение ответов на вопрос: **«Как Вы оцениваете материальное положение следующих групп населения Беларуси?»**

Материальное положение	Плохое	Среднее	Хорошее
Президентская вертикаль	1,5	16,5	82,0
Депутаты	1,9	24,1	74,0
Журналисты	22,3	59,5	18,2

При этом большая часть опрошенных полагает, что материальное положение представителей основных структур власти не соответствует результатам их деятельности:

Распределение ответов на вопрос: **«Соответствует ли жизнь следующих групп населения их заслугам перед обществом?»**

	Живут хуже, чем заслуживают	Живут так, как заслуживают	Живут лучше, чем заслуживают
Президентская вертикаль	2,8	32,4	64,8
Депутаты	3,1	29,2	67,7
Журналисты	40,8	49,5	9,7

Заметим, что негативный образ представителей власти в общественном сознании приводит не только к уменьшению доверия к ним, но и к росту социальной напряженности. Так, 22,5% респондентов считают, что одним из чрезвычайно острых конфликтов в Беларуси является *конфликт между народом и властью,* не уступающий по остроте *конфликту между богатыми и бедными* (21,4%). В то же время анализ показывает, что респонденты усматривают прямую *связь между властью и богатством.*

Невысокий уровень доверия народа к власти, обусловленный снижением уровня жизни и формированием негативного образа ее представителей, может привести к росту *социальной напряженности,* а в итоге и к *политическому кризису.* О потенциальной возможности такого развития событий красноречиво говорят данные следующей таблицы.

Готовность населения участвовать в различных общественно-политических действиях

	Могли бы это сделать
Подписать заявление, обращение	52,2
Участвовать в митинге (демонстрации), разрешенном властями	51,9
Участвовать в оказании поддержки своему кандидату на выборах	49,2
Присоединится к забастовке	47,0
Присоединится к бойкоту	46,9
Участвовать в действиях группы протеста	40,4
Участвовать в работе политической организации	37,4
Участвовать в митинге (демонстрации), не разрешенном властями	31,4
Объявить голодовку	22,1
Занять здание завода, учреждения	21,6

Мы полагаем, что лучше заранее предвидеть возможные негативные тенденции и учитывать их в социально-экономической политике, чем столкнуться с тотальным кризисом.

ГІСТОРЫЯ

Юбілей уніяцкай царквы

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі ў Гродне адчынілася выстава, прысвечаная 400-м угодкам утварэння ўніяцкай царквы

Гістарычная даведка. У 1054 годзе адзіная хрысціянская царква падзялілася на дзве часткі — усходнюю і заходнюю. У 1274 і 1439 гадах у Ліёне і Флярэнцыі былі зробленыя няўдалыя спробы зноў аб'яднаць дзве царквы. Але ажыццявіць гэтую ідэю ўдалося толькі на рэгіянальным узроўні — на Брэсцкім саборы 1596 года, калі ўтварылася ўніяцкая царква.

Чаму гэта адбылося менавіта ў нашай краіне? Гісторыкі даюць тлумачэнне, што маскоўскае княства, наш сусед, пастаянна вяло супраць нас захопніцкія войны, якія спусташалі беларускія землі. Каб абараніцца, Вялікае княства Літоўскае ў 1569 годзе заключыла спачатку палітычны саюз з Польшчай, а пазней была ўтвораная і царкоўная Унія.

Галоўная прычына ў тым, што беларуская праваслаўная царква доўгі час падначальвалася маскоўскай метраполіі, потым у Маскве быў увогуле ўтвораны патрыярхат, які распаўсюджваў сваю ўладу на беларускія землі і які існуе дагэтуль. Такім чынам, царква дапамагала расійскім князям і царам у ажыццяўленні іхняй агрэсіўнай палітыкі ў дачыненні да Беларусі. Гэтая акалічнасць адыграла фатальную ролю ў пазнейшай гісторыі — пасля падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння беларускіх земляў да Расійскай імперыі. У 1794 годзе, калі Рэчы Паспалітай заставалася існаваць апошнія паўтара года, Кацярына II выдала ўказ «Аб выкараненні уніі». Спасылалася яна таму, што ў вызвольным паўстанні Тадэвуша Касцюшкі супраць расійскай акупацыі актыўны ўдзел узялі сяляне ўніяцкага веравызнання і самі ўніяцкія святары. Паводле гэтага ўказу, акупанты адразу прымусам перавялі ў рускую праваслаўную царкву каля 3 мільёнаў уніятаў.

Нянавісць рускіх цароў да беларускай уніяцкай царквы была вельмі выразнай. Паводле Мураўёва-«вешальніка», які пазней жорстка расправіўся з паўстанцамі Кастуся Каліноўскага, уніяты перашкаджалі распаўсюджваць «рускі дух на беларускіх землях». Невыпадкова пазнейшыя гісторыкі назвалі грэка-каталіцкую царкву «народнай» — па дзвюх прычынах: яна аб'ядноўвала большасць хрысціянскага насельніцтва Беларусі, асабліва сялян, і культывавала мову народа — беларускую.

Уніяцкая царква праіснавала на Беларусі 243 гады. Гэта вялікая эпоха ў духоўным развіцці беларускага народа. На нашых землях тады дзейнічала 79 мужчынскіх і 7 жаночых уніяцкіх кляштараў і 28 школ, у якіх атрымлівалі адукацыю беларускія дзеці. Уся краіна была забудаваная прыгожымі ўніяцкімі храмамі, якія рабілі Беларусь архітэктурна адметнай.

Царская акупацыйная ўлады пры дапамозе папоў частку ўніяцкіх храмаў папросту разбурылі, астатнія перарабілі ў цэрквы. (Яскравы прыклад — Свята-Духаў сабор у Мінску). Яны знішчылі царкоўныя арганы, сотні драўляных скульптур, тысячы абразоў, многія тысячы рэлігійных кніжак, у тым ліку немалую частку на беларускай мове, саму Мікалаеўскую царкву, дзе была абвешчана Унія, і кляштарныя забудовы пры царкве, а на гэтым месцы з той самай цэглы пабудавалі Брэсцкую крэпасць.

Сённяшняя палітыка, якая праводзіцца на Беларусі, шмат у чым — працяг колішняй каланіяльнай, якую на нашых землях ажыццяўлялі расійскія цары. Зноў узмацнілася русіфікацыя, зачыняюцца беларускія школы, знішчаюцца падручнікі па гісторыі. Сама адроджаная з нябыту, уніяцкая царква сёння з'яўляецца напаўпадпольнай. Ні адзін храм дзяржава ёй дагэтуль не вярнула і не збіраецца вяртаць.

Сяргей МАКСІМОВІЧ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
2 ліпеня 1996 г., № 48

ЗДАРЭННІ

Пажарныя ўратавалі гісторыю

У Магілёўскім педінстытуце здарыўся пажар, ад якога ледзь не пацярпеў архіў гэтай ВНУ.

Дакладныя дзеянні пажарнікаў выратавалі «для гісторыі» збор дакументаў, сярод якіх знаходзіцца і асабовая справа колішняга студэнта інстытута, а сённяшняга прэзідэнта А.Лукашэнкі.

Іван ЗАСАДА

Сена пайшло з дымам

У калгасе імя Кірава Шклоўскага раёна здарыўся пажар.

Агонь хутка знішчыў сенасховішча (кошт пабудовы — 150 млн. рублёў) і 200 т свежага сена.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Забіла маланкай

У вёсцы Дубіна Магілёўскага раёна маланка забіла жыхара абласнога цэнтра.

Ён у час навальніцы ехаў па вёсцы на веласіпедзе.

Іван ЗАСАДА

Смерць і нарадзіны

З акна чацвёртага паверха Віцебскай інфекцыйнай бальніцы вываліласся 5-гадовая Вераніка Пятрова з вёскі Должа.

Праз чатыры дні яна памерла ў рэанімацыі абласной бальніцы. У той жа дзень яе маці нарадзіла дзяўчынку.

Барыс ХОЛАД

Ахвяра «валютнага калідора»

Амаль 7,5 тыс. долараў страціў 27-гадовы магілёвец, які спрабаваў абмяняць свае 112 млн. рублёў у вулічных мянялаў.

У банк ён не пайшоў з прычыны вельмі нізкага афіцыйнага курсу, а «валютчыкі» падсунулі яму папяровую «ляльку».

Іван ЗАСАДА

Паўцэнтнера наркатычнага зелля

У Светлагорску міліцыя затрымала грамадзяніна Азербайджана з 50 кілаграмамі макавай саломкі.

Па словах начальніка Светлагорскага РАУС Уладзіміра Асіпенкі, сёлета ў Светлагорску зафіксавана ўжо 130 выпадкаў вырабу, захоўвання і продажу наркотыкаў. За ўвесь мінулы год такіх выпадкаў было 170.

В.Я.

Зняволены хоча на курорт

Адзін зняволены бабруйскай папраўчай калоніі звярнуўся праз мясцовыя газеты да бізнесменаў з вельмі арыгінальнай ідэяй.

Ён прапануе выкарыстоўваць танную працоўную сілу калоніі і наладжваць на яе тэрыторыі прыбытковыя вытворчасці. На думку зняволенага, «супрацоўніцтва» павінна развівацца па такой схеме: палову кантрактнага тэрміну «зэкі» працавалі б у зоне, а другую палову — ужо на волі. Прычым наймальнік павінен забяспечыць паявлічаны харчовы паёк і магчымасць адпачынку на адным з замежных курортаў.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

ДАЙДЖЭСТ

Аўтамабілі абганяюць гук

Гэтым летам Брытанія і Амерыка сутыкнуцца ў незвычайным спаборніцтве за рэкорд хуткасці на сушы.

34-гадовы пілот бамбардзіроўшчыка *Tornado* брытанец Эндзі Грын і 58-гадовы ветэран спаборніцтваў на хуткасць амерыканец Крэйг Брыдлаў (ён у свой час пераадолеў бар'еры 640, 800 і 960 км у гадзіну) будуць змагацца за тытул самага хуткага аўтамабіліста свету. Іхнія машыны, праўда, больш будуць нагадваць касмічныя караблі, чым звычайныя аўто. Хто рушыць першым — вырашыць падкіданне манеты. Арганізатары спаборніцтваў лічаць, што прынамсі адзін з удзельнікаў зможа перасягнуць хуткасць гуку — 1.224 км у гадзіну.

Апошні рэкорд хуткасці — 1.020 км/г — быў устаноўлены 13 гадоў таму брытанцам Рычардам Ноўблам. Менавіта ён узначаліў групу канструктараў, якія стварылі *Thrust SSC* — машыну Грына. *SSC* расшыфроўваецца проста: *supersonic car* — звышгукавы аўтамабіль. На ім устаноўлены два рухавікі фірмы *Rolls-Royce* агульным коштам 3 млн. фунтаў стэрлінгаў (каля 4,5 млн. долараў). Гэтыя суперматоры маюць магутнасць 106.000 конскіх сіл (для параўнання: «жыгулі» 9-й мадэлі маюць рухавік у 75 конскіх сіл). Аўтамабіль *SSC*, які важыць ажно сем тон, за 4 секунды развівае хуткасць 160 км/г, а яшчэ праз 14 секунд пераходзіць рысу 1.000 км у гадзіну. На думку канструктараў, не будзе праблемы дасягнуць хуткасці нават 1.350 км/г.

Машына Брыдлава параўнальна невялікая — важыць «толькі» 4,5 т і мае адзін ракетны рухавік магутнасцю 48 тысяч конскіх сіл. Затое ў яе вельмі натхняльнае імя *Spirit of America* — «дух Амерыкі». Зрэшты, Брыдлаў кажа, што для яго галоўнае — устанавіць новы рэкорд хуткасці, і ці будзе пры гэтым пераадолены гукавы бар'ер — не так важна.

Публічныя пакаранні ў Кітаі

769 чалавек у Кітаі былі прыгавораныя да смяротнай кары або пажыццёвага турэмнага зняволення.

Такім чынам кітайскія ўлады «адзначылі» дату 26 чэрвеня — абвешчаны ААН Дзень барацьбы з наркотыкамі. 262 трыбуналы разглядалі справы 1700 кантрабандыстаў, гандляроў і наркаманаў. Смяротныя пакаранні выконваліся публічна ў спецыяльна арганізаваных месцах, экзекуцыі назіралі больш за 2 мільёны гледачоў. Большасць пакараных — кантрабандысты з краін «жоўтага трохкутніка» (Бірма, Лаос, Тайланд), якія праз тэрыторыю Кітая дастаўлялі наркотыкі ў Ганконг і ЗША.

Кітайскія ўлады прымяняюць надзвычай жорсткія меры барацьбы з наркабізнесам. Разам з тым вытворчасць, транспарт, гандаль наркотыкамі — адзіная крыніца даходаў для многіх мільёнаў кітайцаў, асабліва ў эканамічна адсталых паўднёвых правінцыях.

Мужныя пацыенты

Двое злачынцаў у масках уночы напалі на туберкулёзны шпіталь у польскім горадзе Жэшаве.

Яны спрабавалі прабрацца ў памяшканне, дзе знаходзіліся псіхатропныя лекі і наркотыкі. Аднак злачынцаў затрымалі пацыенты шпіталя, узброеныя... штатывамі для сістэм унутрывеннага пералівання.

СПОРТ

Рэванш праз 20 гадоў

ФУТБОЛ: **EURO'96**

Вось і скончыўся Х чэмпіянат Еўропы — падзея, якой чакалі сотні мільёнаў заўзятараў футбола ва ўсім свеце. Фінальны матч, як і ўвесь турнір, быў споўнены драматызмам і нечаканымі паваротамі. Ён, зрэшты, меў цікавую перадгісторыю. 20 гадоў таму ў фінале сустракаліся зборныя Чэхаславакіі і ФРГ. Гульнёвы час скончыўся ўнічыю, а па пенальці перамаглі чэхаславацкія спартсмены. Шмат вады сплыло з таго часу: аб'ядналіся ФРГ і ГДР, раздзялілася Чэхаславакія. Новыя зборныя каманды новых краінаў лёс звёў у мінулую нядзелю на лонданскім стадыёне «Уэмблі». Тры тыдні перад гэтым у першым матчы групавога турніру немцы выйгралі — 2:0.

У фінале яны адразу прыціснулі сапернікаў да варотаў. Чэхі адказвалі вострымі контратакамі, завадатарамі тут былі Павэл Кука і Карэл Пабарскі. За 10 хвілін да перапынку Кунц, выкарыстоўваючы памылку чэшскіх абаронцаў, выходзіць адзін на адзін з варатарам, б'е. Коўба ледзь здолеў дакрануцца да мяча, які ўзлятае ўгару і па дузе ляціць у пустыя вароты, але адтуль яго паспявае выбіць Рада. Пачатак другога тайма — рашучы наступ чэхаў. Чарговы праход Пабарскага спыняе Замер — пенальці. На відэапаўторы было добра відаць, што калі нават парушэнне і было (а гэта выклікае сумненні), дык не ў штрафной. Італьянскі арбітр П'ерлуіджы Пайрэтэ вокам не міргнуўшы прызначыў 11-метровы, які моцным нізавым ударам рэалізаваў Патрык Бэргер. Атрымаўшы перавагу ў ліку, чэхі дапусцілі тую ж стратэгічную памылку, што і англічане ў паўфінальным матчы, — яны саступілі ініцыятыву сапернiку. І калі такая тактыка сышла з рук у матчы з Расіяй, то з Германія падобныя рэчы не праходзяць беспакарана. Запушчаны махавік атак германскай зборнай спыніць было ўжо немагчыма. Настаўнік нямецкай каманды Бэрці Фогмс тонка адчуў сітуацыю — і замяніў Мехнета Шоля на Олівера Біргофа. Менавіта Біргоф праз некалькі хвілін пасля выхаду на поле выкарыстаў дыяганальны навес са штрафнога Крыстыяна Цыге і галавой з адлегласці 5-6 метра пацэліў у вароты здранцвелага Коўбы — 1:1.

У пяты раз на гэтым чэмпіянаце давялося прызначаць дадатковы час. І ўпершыню было рэалізаванае правіла «залатога гола», або «раптоўнай смерці». Гэта значыць, каманды гуляюць дадатковыя 30 хвілін да таго моманту, калі адзін з сапернікаў заб'е гол. Вырашальны мяч у вароты Чэхіі ўжо на 95-й хвіліне адправіў той самы Біргоф. Атрымаўшы мяч у штрафной, ён, хоць і стаяў спіной да варотаў, здолеў акрунуцца і трапна стрэліць. Варатар чэхаў, закрыты іншымі ігракамі, адрэагаваў запозна.

Германія—Чэхія — 2:1. Галы: Біргоф (2); Бэргер (з пенальці).

Паводзячы вынікі *EURO'96*, варта адзначыць некалькі дэталяў. Па-першае, заслужана перамагла зборная Германіі, якая прадэманстравала і высокі ўзровень майстэрства, і ўласцівую немцам дысцыпліну і парадак на полі, і выдатныя валявыя якасці. Менавіта яны дапамаглі пераможцам выстаяць супраць англічанаў і пераламаць ход фінальнага двабою на сваю карысць. Дарэчы, гэта адзіны выпадак на чэмпіянаце, калі поспеху дамагліся каманда, якая прапусціла першы гол.

Па-другое, сенсацыяй турніру стала каманда Чэхіі, якая паказала ўзор прыгожага, паўнаякаснага футболу. Чэхі, у адрозненне ад сваіх сапернікаў, не мусолілі мяч, не перакідвалі яго бязмэтна адзін аднаму, а серыяй доўгіх і сярэдніх пасаў, часта на дыяганалі, кідалі ў прарыў хуткіх, высокатэхнічных Пабарскага, Куку, Недведа. Можа быць, ім не хапіла для канчатковай перамогі волыту і роўнага падбору выканаўцаў.

Па-трэцяе, гэты чэмпіянат стаў «трэнерскім». Самымі яркімі асобамі *EURO'96* сталі настаўнік чэхаў Душан Угрын, яго англійскі калега Тэры Венэйблс і трэнер зборнай Германіі Бэрці Фогмс. Іхняя фантазія, прафесійная інтуіцыя, тонкі псіхалагізм, нарэшце, проста інтэлігентнасць прывялі ўзначаленыя імі каманды да поспеху. У той жа час трэнеры зборных Францыі і Партугаліі Эме Жаке і Анмоніу Алівэйра не змаглі рэалізаваць надзвычай высокі патэнцыял сваіх ігракоў. А неўключэнне ў склад французскай каманды Эрыка Кантаны — самы вялікі канфуз чэмпіянату. Магчыма, менавіта гэтая памылка і каштавала Францыі залатых медалёў.

Капітан зборнай Германіі Юрген Клінсман

Па-чацвёртае, турнір пацвердзіў, што мала валодаць наборам проста моцных ігракоў. Каб дамагчыся поспеху на еўрапейскім узроўні, патрэбныя зоркі — такія, напрыклад, як немцы Кёпке, Клінсман і Замер, чэхі Пабарскі, Кука, Латал, англічане Гаскойн, Шырэр, Сімэн, французы Джаркаеф, Карабмэ, Блан, харват Шукер.

КУБАК ІНТЭРТОТА: «АТАКА» РАЗБІВАЕ «ШАХЦЁР»

Сенсацыйнай перамогі дамагліся футбалісты мінскага клуба «Атака-Аўра» ў Данецку. У матчы Кубка Інтэртота гадаванцы Якава Шапіры перамаглі адну з самых моцных украінскіх каманд — данецкі «Шахцёр» — 2:1. У мінчан галы забілі Юрый Дарашкевіч і Юрый Малееў.

ФОРМУЛА-1: БЕЗ ШУМАХЕРА

Ужо на прагрэвачным крузе быў вымушаны развітацца з думкай пра перамогу чэмпіён свету Міхаэль Шумахер. Прычына банальная — згарэў рухавік. У адсутнасць «Шумі» шостую перамогу ў гэтым сезоне атрымаў Дэйман Хіл (Вялікабрытанія), які на 8 секунд перагнаў Жака Вільнёва і на 46 — Жана Алезі. Пасля 9 этапаў наперадзе Хіл — 63 ачкі, Вільнёў — 38, Шумахер — 26, Алезі —25.

ТЭНІС: НАТАЛЛЯ І ДЖЫ ДЖЫ

Мінчанка Наталля Зверава і амерыканка Джы Джы Фернандэс працягваюць барацьбу ў жаночым парным разрадзе на Уімблдонскім турніры ў Англіі. У адзіночным разрадзе Наталля, на жаль, прайграла ўжо ў другім крузе.

Сямён ПЛОЦ

Піва як сімвал польскай дзяржаўнасці

Польскае Таварыства культуры піва распаўсюдзіла адкрыты ліст, адрасаваны прэзідэнту А.Квасьнеўскаму.

Аматары піва выказваюць прэтэнзіі, што па тэлебачанні часта можна ўбачыць, як прэзідэнт частуе замежных гасцей шампанскім. «Гэтае пітво не мае нічога агульнага з польскай традыцыяй. Патрабуем замяніць яго напоем, які вядомы з самага заснавання польскай дзяржавы, а менавіта півам», — гаворыцца ў лісце.

Паводле паведамленняў агенцтваў Reuter, Associated Press, PAP, матэрыялаў замежнай прэсы падрыхтавала Магдалена НЕПАКАЙ

МБП «Минскгортурист»
приглашает на отдых
в Болгарию!
Курорт «Солнечный берег», гостиница «Континенталь»**
с завтраком (шведский стол),
200 м от моря.
Вылет самолетом из а/п Минск-2.
Детям скидка!
Стоимость $395 по курсу.
Справки по тел.:
27-18-07,
27-48-88,
23-76-15.
Факс: 23-75-54.
Наш адрес: г.Минск, ул.Комсомольская, 17.

Да ўвагі рэкламадаўцаў
Базавы кошт рэкламнай плошчы – 19700/см²
31 чэрвеня дзейнічаюць сезонныя скідкі:
✓ для рэкламных агенцтваў – 50%
✓ для турфірм – 60%

Стэлажы і стойкі



Выраб з улікам вашых пажаданняў
тэл. 236-24-41
Еўрапейская якасць!

ПАТРАБУЕЦЦА
токар для работы на дрэваапрацоўчым станку.
Тэл. 262-04-80 з 8:30 да 10:00.

Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by © СВАБОДА Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 39.500
Нумар падпісаны ў друк 1.07.96 (15.00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 10 Заказ 251

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010